Кулажанка, У. Г. Дакументальныя крыніцы па гісторыі беларускай праваслаўнай царквы ХХ ст. у архівах Беларусі: праблемы іх публікацыі і навуковага выкарыстання / У. Г. Кулажанка // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў ХХ—ХХІ ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 217-221

**У. Г. КУЛАЖАНКА (Мінск)**

# ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ ХХ ст. У АРХІВАХ БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМЫ ІХ ПУБЛІКАЦЫІ І НАВУКОВАГА ВЫКАРЫСТАННЯ

Як вядома, шырокае вывучэнне дакументальнай базы па царкоўнай гісторыі Беларусі актыўна пачалося ў другой палове ХІХ ст. Арганізаваны пошук, навуковы ўлік, апісанне і выданне пісьмовых помнікаў было звязана, у першую чаргу, з імёнамі вядомых гісторыкаў і археографаў М. К. Баброўскага, П.М. Бацюшкава, І. І. Грыгаровіча, І. М. Даніловіча, А. І. Мілавідава, А. П. Сапунова і інш. Іх намаганнямі быў створаны добра распрацаваны навуковадаведачны апарат па гісторыі царквы, выдаваліся археаграфічныя зборнікі дакументаў, даведнікі, каталогі, вопісы, апісанні царкоўных фондаў. Да пачатку ХХ ст. царкоўна-гістарычная тэма займала значную частку сярод усіх апублікаваных на той час гістарычных крыніц.

Пасля 1917 г. савецкай гістарычнай навукай многія пытанні царкоўнай гісторыі зусім не распрацоўваліся альбо разглядаліся тэндэнцыйна; амаль цалкам закрытай тэмай была навейшая царкоўная гісторыя і літаратура ХХ ст. І гэта пры тым, што савецкая навука зрабіла немалы ўклад, у тым ліку і ў Беларусі, у рамках гісторыка-культурных даследаванняў па вывучэнні крыніц старажытна-рускага перыяду. Былі апублікаваны старажытныя летапісы, палемічныя і агіяграфічныя творы. Парадаксальна, але факт: з другой паловы 1930-х і да канца 1980-х гг. у СССР было апублікавана больш жыццяў рускіх святых, чым у дарэвалюцыйны час. Працягам гэтай працы стала выкананне ў Інстытуце літаратуры НАН Беларусі першага абагульняючага выдання аб жыцці беларускіх святых[1].

Пасля ўрачыстага святкавання 1000-годдзя Хрышчэння Русі (1989 г.), як вядома, пачалося адраджэнне царкоўнага жыцця на ўсёй постсавецкай прасторы. Набыло актуальнасць і стала прадметам аб'ектыўнага навуковага даследавання і вывучэнне навейшай гісторыі царквы.

Навейшы перыяд у вывучэнні царкоўнай гісторыі Беларусі ХХ ст. з'яўляецца па-свойму унікальным. Даследаванні ўзаемаадносін дзяржавы і царквы, а таксама ўнутранага жыцця царквы, святарства, прыходскіх абшчын стала важнай часткай гісторыі Беларусі і яе народа. З 1990-х гг. больш актыўна пачала распрацоўвацца крыніцазнаўчая база па гэтай тэме. У апошнія гады выйшлі работы, якія даюць уяўленне пра некаторыя, раней малавядомыя этапы і падзеі царкоўнай гісторыі ХХ ст.



Аднак да гэтага часу адсутнічае абагульняючая работа, прысвечаная найноўшаму перыяду ў гісторыі царквы ў Беларусі. Відавочна, што прычынай з'яўляецца наяўнасць «белых плям» і слабы стан вывучэння дакументальнай базы па дадзенай тэме. Гэта звязана з існаваннем пытанняў, якія датычацца выяўлення, апісання і публікацыі дакументаў па гісторыі царквы.

Дакументальныя крыніцы па царкоўнай гісторыі ХХ ст., якія захоўваюцца ў архівах, характарызуюцца немалым аб'ёмам і разнастайнасцю, а адсутнасць тэматычных навукова-даведачных дапаможнікаў доўгі час ускладняла іх вывучэнне і выкарыстанне. Рост запатрабаванасці ў такіх даведніках стымуляваў бы працу ў гэтым напрамку архівістаў.

Першым прыкладам сталі археаграфічныя зборнікі дакументаў, якія ўтрымліваюць імянныя альбо біяграфічныя анатаваныя паказальнікі ў выглядзе дадаткаў па гісторыі царквы, выдадзеныя ў Расійскай Федэрацыі. Яны адлюстроўваюць і дакументы, якія датычацца Беларусі. Гэта — «Акты Святейшего Тихона, Патриарха Московского и всея России» (М., 1994) і «Следственное дело Святейшего Патриарха Тихона» (М., 2000), «Материалы по истории церкви. Нацистская Германия и Православная церковь: Нацистская политика в отношении Православной церкви и религиозное возрождение на оккупированной территории СССР» (М., 2002) і інш.

Вынікам выяўлення корпуса дакументаў па гісторыі Праваслаўнай царквы ў архівах Расіі стала выданне анатаваных даведнікаў-паказальнікаў: «История Русской Православной Церкви в документах

региональных архивов России» (М., 1993) і «История Русской Православной Церкви в документах федеральных архивов России, архивов Москвы и Санкт-Петербурга» (М., 1995), «Монастыри Русской Православной Церкви. Аннотированный указатель фондов архивов РФ» (М., 1996). У стадыі завяршэння знаходзіцца сумеснае выданне, падрыхтаванае Цэнтрам архіўных даследаванняў Гісторыка-архіўнага інстытута РДГУ пад кіраўніцтвам прафесара Я. В. Старасціна пад назвай «Путеводитель по архивам РПЦ в России, Украине, Беларуси».

Падобная праца актыўна праводзілася і на Украіне. Там убачылі свет наступныя выданні: Слободянюк П. «Українська церква: Історія руїни і відродження» (К., 1999); «Перший Всеукраїнський православний церковний собор УАПЦ 14—30 жовтня 1921 р. Документи і матеріали» / Склад. Г. М. Михайличенко, Л. Б. Пилявець, І. М. Преловська (К., Львів, 1999); «Митрополит Андрей Шептицький: Життя і діяльність. Документи і матеріали. 1899—1944. Т. 2: Церква і суспільне питання. Кн. 1: Пастирське вчення та діяльність» / Склад. О. Гайова, А. Кравчук (Львів, 1999).

У Беларусі падобны даведнік з’явіўся пазней. Міжархіўны даведнік «Документы по истории Православной церкви на Беларуси XVIII—XX вв. в фондах



государственных архивов Республики Беларусь» складаецца з 13 раздзелаў, у адпаведнасці з гістарычна складзенымі комплексамі дакументаў па гісторыі Праваслаўнай царквы Беларусі; ён дапоўнены імянным і прадметна-геаграфічным паказальнікамі.

Прадстаўленыя ў даведніку асноўныя дакументальныя комплексы можна падзяліць паводле паходжання на дзве часткі. Да першай адносяцца комплексы дакументаў, якія захоўваюцца ў дзяржаўных архівах рэспубліканскага і мясцовага ўзроўняў, дзе галоўным чынам адлюстравана дзейнасць дзяржаўных устаноў адносна царквы і стасункі паміж імі. Гэта — фонды Цэнтральнай камісіі па справах культаў пры ЦВК БССР, Упаўнаважанага Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры СМ СССР па БССР і яго упаўнаважаных па абласцях (1944—1965 гг.), Упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР па БССР і яго ўпаўнаважаных па абласцях (1944—1965 гг.), Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій пры СМ СССР па БССР і яго ўпаўнаважаных па абласцях (1965—1984 гг.); дакументы дзяржаўных органаў кіравання (ЦВК БССР, НКУС БССР, Дзяржбуд БССР, абласныя, раённыя, сельскія Саветы народных дэпутатаў і іх выканкомы), фонды грамадскіх арганізацый (КПБ, ЛКСМБ, прафсаюзы), а таксама дакументы польскіх уладаў у Заходняй Беларусі (1919—1938 гг.). У гэтай групе прадстаўлены нарматыўна-распарадчыя і рэгістрацыйныя дакументы, справаздачы, перапіска, статыстыка, звароты грамадзян і г. д.

Да другой групы належаць дакументы ўнутрыцаркоўнага справаводства і дакументы асабістага паходжання. Сюды адносяцца: дакументы Беларускага праваслаўнага сінода (1922—1935 гг.); Упраўлення Мінскага архіерэйскага дома (1917—1924); Мінскага, Віцебскага, Гомельскага, Магілёўскага епархіяльных упраўленняў (1922—1935 гг.), якія знаходзяцца ў дзяржаўных архівах, і дакументы (1947—1985 гг.), якія захоўваюцца ў архіве Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, а таксама прыватныя архівы царкоўных дзеячаў.

Асобную групу складаюць дакументы і матэрыялы савецкіх рэпрэсіўных органаў, а таксама дакументы, якія адлюстроўваюць палітыку Трэцяга рэйха ў Беларусі.

Частка архіўнай спадчыны Беларускай царквы XX ст. захоўваецца за межамі рэспублікі: у Маскве, Варшаве, Вільнюсе. Вялікую цікавасць для архівістаў і даследчыкаў уяўляе Архіў Епіскапата Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (1941—1946 гг.), які захоўваецца ў Беларускім інстытуце навукі і мастацтва (Нью-Йорк, ЗША). Беларусамі замежжа падрыхтаваны выдавецкі праект серыі кніг па гэтых матэрыялах. Першая з іх пабачыла свет у 2005 г. — «Мікалай Лапіцкі “У служэнні Богу і Беларусі”», (Нью-Йорк; Варшава, 2005), укладальнік і аўтар прадмовы Юры Гарбінскі.



У Беларусі работа па выкарыстанні і публікацыі архіўных дакументаў па гісторыі царквы актыўна пачалася з другой паловы 1990-х гг. З’явілася першае выданне, зробленае на аснове архіўных матэрыялаў: Працька Т. Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну: Мітрапаліт Мелхіседэк (Мн., 1996), падрыхтаванае ў акадэмічным Інстытуце гісторыі «Канфесіі на Беларусі», а таксама працы В. Чарапіцы. Матэрыялы па гісторыі Гродзенскай епархіі 1920—1930-х гг. (Гродна, 1998) і В. Касцюка. Гісторыя Палескай епархіі. У 2003 г. у Гродзенскім універсітэце Святланай Сіловай была падрыхтавана і абаронена кандыдацкая

дысертацыя «Праваслаўнае духавенства Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Важна адзначыць, што даследаванні з выкарыстаннем дакументальнай базы актыўна сталі праводзіцца і ў духоўных школах — Мінскіх духоўнай семінарыі і акадэміі. Штогод абараняюцца кандыдацкія і магістэрскія работы па царкоўна-гістарычнай тэматыцы, у тым ліку па гісторыі асобных благачынняў, епархій, а таксама даследаванні, прысвечаныя жыццю і служэнню царкоўных іерархаў і царкоўных дзеячаў.

Асаблівая тэма — аднаўленне гістарычнай праўды адносна тысяч рэпрасіраваных, у тым ліку святароў і актыўных прыхаджан у 1920—30-я і пасляваенныя гады. Для параўнання звернемся да прыкладу расійскіх архівістаў, якія працуюць у гэтым напрамку разам з прадстаўнікамі РПЦ. Напрыканцы XX ст. даследчыкі атрымалі доступ да багацейшага пласта дакументальнай інфармацыі — судова-следчых дакументаў рэпрэсіўных устаноў. Пад кіраўніцтвам вядомага расійскага даследчыка лёсаў рэпрэсаванага духавенства ігумена Іаана Дамаскіна быў створаны даведнік «Мученики, исповедники и подвижники благочестия Русской православной церкви XX столетия». Даследаванні ў гэтым напрамку ў Расіі праводзіць створаны ў Маскве ў 1997 г. Фонд памяці мучанікаў і вызнаўцаў Рускай праваслаўнай царквы, супрацоўнікі якога вядуць работу па складанні даведніка «Персональная информация о духовенстве Московской епархии XX столетия». У даведнік ўключаны кароткія і поўныя паслужныя спісы, характарыстыкі, рапарты, загады аб перамяшчэнні святароў з указаннем на від архіўнага дакумента і архіўнага шыфру. Праца над даведнікам працягваецца, на сённяшні дзень уключаны дадзеныя на 2259 чалавек.

Трэба адзначыць, што ў Беларусі зроблены толькі першыя крокі па выкарыстанні і публікацыі адпаведных архіўных крыніц. У 2002 г. выйшла кніга іерэя Фёдара Крываноса «Жития священномучеников Минской епархии: 1-я половина XX века», дзе надрукаваны не толькі біяграфіі кананізаваных 23-х новамучанікаў, але і некаторыя дакументы з Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь. Наступным стала сумеснае выданне гэтага ж аўтара і выкладчыка Мінскай духоўнай семінарыі Гардзея Шчаглова, якая ўзнаўляе жыццё і пакутніцкую канчыну епіскапа Гомельскага Іаана ў 1937 г.[2] Цікава



адзначыць, што работу па даследаванні і выкарыстанні дакументаў адносна жыцця і смерці рэпрэсіраваных святароў беларускага паходжання вядуць нашы калегі ў Польшчы. У 2004 г. у Варшаве пабачыла свет кніга «Mczenniki XX wieku. Martyrologia Prawosiawia w Polsce w biografjach œwiktych», укладзеная Яраславам Харкевічам. Паводле меркавання некаторых даследчыкаў, спіс рэпрэсіраваных святароў Беларусі складае больш за 1000 асоб. Беларускім даследчыкам Л. У. Мараковым падрыхтаваны зборнік «Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі», які здадзены ў друк у канцы 2006 г. Найбольш актыўна ў гэтым напрамку працуюць архівісты і прадстаўнікі царквы ў Віцебску. Аддзелам па архівах і справаводстве Віцебскага аблвыканкома і Віцебскім аддзяленнем Беларускай археаграфічнай камісіі падрыхтаваны і выдадзены зборнік дакументаў па гісторыі царквы на Віцебшчыне[3]. Пры Віцебскай епархіі створаны архіўны аддзел па даследаванні спраў рэпрэсіраванага духавенства. Яго матэрыялы размешчаны на афіцыйным інтэрнэт-сайце Віцебскай епархіі[4].

На сённяшні дзень цалкам не даследаванымі застаюцца крыніцы па гісторыі 1960-х гг. — перыяду масавага закрыцця храмаў, хрушчоўскіх праследаванняў святарства і вернікаў. Вядома, напрыклад, што частымі былі выпадкі супраціўлення на месцах, прыхаджанамі пісаліся шматлікія пратэсты і інш. Даследаванне гэтых фактаў дадало б важныя штрыхі да характарыстыкі менталітэту, грамадскай і рэлігійнай свядомасці насельніцтва Беларусі таго часу. Пра складанасць сітуацыі з даследаваннем крыніцазнаўчай базы сведчыць удзел беларускіх аўтараў у напісанні артыкулаў для шматтомнай «Праваслаўнай энцыклапедыі», якая выдаецца ў Маскве з 2000 г.[5] З аднаго боку, высокі навуковы ўзровень выдання стымулюе нашых аўтараў да больш глыбокіх даследаванняў, а з другога — часта паказвае адсутнасць магчымасці напісаць адпаведны тэкст і таму нярэдка на беларускія тэмы пішуць спецыялісты з іншых краін.

Такім чынам, узровень крыніцазнаўчага забеспячэння, а таксама тэндэнцыі распрацовак гісторыка-царкоўнай тэматыкі ў Беларусі і за мяжой сведчаць аб неабходнасці больш шырокага выяўлення, выкарыстання і публікацыі архіўных дакументальных крыніц па названай перспектыўнай тэматыцы.

---

[1] Мельников А. А. Путь непечален: исторические свидетельства о святости Белой Руси. Мінск, 1992.

[2] Щеглов Г. Священномученик Иоанн Пашин. Минск, 2005.

[3] Православная церковь на Витебщине (1918—1991 гг.): Документы и материалы / Под ред. М. В. Пищулёнка. Минск, 2006.

[4] www.vitebsk.ortodoxi.ru

[5] Православная энциклопедия. Т. 1—10. М., 2000—2005.